# СТАНАЎЛЕННЕ СІСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКІ МУЗЕЙНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У БЕЛАРУСІ

**І. І. Бамбешка,** *ст. выкладчык*
*кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

Пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы набываюць вялікае значэнне ў сувязі з павелічэннем колькасці музеяў у краіне, інтэнсіфікацыяй іх дзейнасці і фарміраваннем музеязнаўства як навуковай і вучэбнай дысцыпліны.

У канцы XVIII ст. у Беларусі пачалі стварацца першыя музеі пры навучальных установах. Яны былі даступны больш шырокаму колу асоб, чым калекцыі прыватных музеяў, што існавалі з XVI ст. у маёнтках беларускіх магнатаў і заможнай шляхты.

У сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца музеі пры дзяржаўных установах (губернскіх статыстычных камітэтах, губернскіх палатах дзяржаўных маёмасцей і інш.), грамадскіх арганізацыях і аб'яднаннях (царкоўна-археалагічных камітэтах, архіўных камісіях і інш.). Ініцыятарамі стварэння падобных музеяў выступалі дзяржаўныя органы ўлады (у асобе губернатараў), духоўныя асобы, навукоўцы і краязнаўцы.

Аднак на тэрыторыі Беларусі не існавала сістэмы падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў. Навыкі музейнай прафесіі набываліся непасрэдна ў працэсе работы ў музеі, буйнейшыя тагачасныя музеі з'яўляліся школай падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, перш за ўсё захавальнікаў.

Тым не менш ужо ў канцы XIX – пачатку XX ст. у Расіі, як і ў многіх краінах свету, была асэнсавана неабходнасць спецыяльнай падрыхтоўкі музейных кадраў, што выклікана ростам колькасці музеяў і вялікай увагай да праблем захавання, вывучэння і папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны. У створаным у 1907 г. Маскоўскім археалагічным інстытуце пачаў чытацца спецыяльны курс «Уводзіны ў музеязнаўства» [7, с. 289].

У 1911 г. па ініцыятыве Віцебскай вучонай архіўнай камісіі было адкрыта Віцебскае аддзяленне згаданага інстытута. Праграма падрыхтоўкі на гэтым аддзяленні істотна не адрознівалася ад праграмы галаўнога інстытута, хаця яна была скарэкціравана з улікам мясцовай спецыфікі. Пералік дысцыплін, што чыталіся для слухачоў аддзялення, уключаў як агульнагістарычныя, так і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльныя гістарычныя курсы: рускую гісторыю, рускую гістарыяграфію, рускую гістарычную геаграфію, рускія юрыдычныя старажытнасці, чытанне найважнейшых помнікаў рускага права са старажытных часоў да XVIII ст., гісторыю рускай мовы, славяна-рускую палеаграфію, чытанне старажытных рукапісаў, грэчаскую палеаграфію, грэчаскую эпіграфіку, гісторыю археалагічных адкрыццяў, гісторыю рускага мастацтва, гісторыю эстэтычных вучэнняў, храналогію і метралогію, бібліятэказнаўства, грэчаскую, лацінскую, нямецкую мовы, гісторыю народнай гаспадаркі, першабытную археалогію, гісторыю ўстаноў Расіі, дыпламатыку агульную і спецыяльную, філасофію гісторыі, гісторыю рускай літаратуры, генеалогію, геральдыку ўсеагульную і рускую, сфрагістыку, лацінскую палеаграфію, архівазнаўства [3]. Аднак пры пераліку дысцыплін, якія выкладаліся ў Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута, музеязнаўства не згадваецца (але прысутнічаюць такія навукі, як архівазнаўства і бібліятэказнаўства) [3]. Атрымліваецца, што кіраўніцтва Віцебскага аддзялення палічыла непатрэбным увядзенне для слухачоў курса па музеязнаўстве, хаця ў Віцебску (як і ў іншых гарадах Беларусі) у канцы XIX – пачатку XX ст. быў створаны шэраг музеяў.

Важна адзначыць, што ў той час у вышэйшых навучальных установах выразны музейны ўхіл мелі лекцыйныя курсы і семінарскія заняткі па этнаграфіі і археалогіі.

Такім чынам, бачна, што супрацоўнікі беларускіх музеяў у акрэслены перыяд былі пазбаўлены магчымасці атрымаць музеязнаўчую адукацыю, але былі спецыялістамі ў профільных для музея дысцыплінах: прыродазнаўстве, гісторыі і археалогіі, мастацтвазнаўстве і інш.

З асаблівай вастрынёй праблема падрыхтоўкі музейных кадраў паўстала пасля 1917 г. Гэта было выклікана перш за ўсё значным ростам колькасці музеяў (асабліва ў правінцыі), эміграцыяй часткі музейных супрацоўнікаў, а ў далейшым – масавым адхіленнем ад музейнай дзейнасці нелаяльных да бальшавіцкай ідэалогіі асоб. Такая сітуацыя ў некаторай ступені была характэрна і для БССР, дзе ў 1920-я гг. была створана значная колькасць музеяў, прычым большасць з іх – краязнаўчыя. Таму пытанне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для музеяў было надзвычай злабадзённым і актуальным. Так, на пасяджэннях музейнай рады Беларускага дзяржаўнага музея (БДМ) неаднаразова адзначалася неабходнасць наладжвання падрыхтоўкі музейных спецыялістаў. Супрацоўнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музея прапаноўвалі для большай эфектыўнасці вучнёўскіх экскурсій арганізоўваць для настаўнікаў спецыяльныя курсы.

У маі 1924 г. адбылася Першая ўсебеларуская нарада архівістаў, на якой уздымаліся пытанні падрыхтоўкі кадраў архівістаў. З дакладамі па гэтай праблематыцы выступалі рэктар БДУ У. І. Пічэта, былы кіраўнік Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута Б. Р. Брэжга, старшыня Інбелкульта С. М. Некрашэвіч, намеснік загадчыка Цэнтрархіва М. В. Мялешка і загадчык Цэнтрархіва З. Ф. Жылуновіч. Менавіта З. Ф. Жылуновіч прапанаваў адкрыць не толькі архіўныя курсы пры БДУ, за якія выступаў У. І. Пічэта, але і музейна-бібліятэчныя [6, с. 44]. Паводле дакладаў У. І. Пічэты і Б. Р. Брэжгі была прынята рэзалюцыя: «Заслухаўшы даклады… нарада беларускіх архівістаў лічыць неабходным утварыць у бліжэйшыя часы курсы для падрыхтоўкі архіўных, музейных і бібліятэчных працаўнікоў…» [6, с. 53]. Аднак прынятая рэзалюцыя ў дачыненні да музейных спецыялістаў не была рэалізавана.

Больш паспяховай аказалася спроба арганізацыі курсаў па краязнаўстве пры БДУ, якія былі наладжаны ў 1927/28 акадэмічным годзе. Ініцыятарамі такіх курсаў былі намеснік старшыні ЦБК А. З. Казак, дырэктар БДМ В. Ю. Ластоўскі і навуковы супрацоўнік ЦБК М. І. Касяровіч. На імя народнага камісара асветы ў ліпені 1927 г. была накіравана службовая запіска, у якой адзначалася, што, нягледзячы на шырокае развіццё краязнаўчага руху, на месцах не хапае адпаведных спецыялістаў, у прыватнасці ў галіне музейнай справы. Разам з тым базай для краязнаўчай працы і значнымі ўстановамі асветнага характару ў рэгіёнах з'яўляліся музеі. Аўтары службовай запіскі ў сувязі з гэтым звярталіся ў Наркамат асветы з просьбай арганізаваць падрыхтоўку краязнаўцаў-музеязнаўцаў. Прапаноўвалася рэалізаваць гэта шляхам утварэння інстытута практыкантаў пры БДМ, куды запрашаць лепшых працаўнікоў з месц і прызначыць ім стыпендыю. У выпадку, калі стыпендыю будзе выплачваць немагчыма, прапаноўвалася арганізаваць секцыю з дзесяці чалавек на вышэйшых курсах грамадазнаўства з тым, каб яны практыкаваліся ў музеі і «падрыхтаваліся як спецыялісты-музеязнаўцы». Акрамя таго, звярталася ўвага кіраўніцтва Наркамата асветы на неабходнасць прыцягнення лектараў для чытання лекцый па музеязнаўстве. У выніку паспяховага вырашэння дадзенага пытання рэгіёны павінны былі атрымаць не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі спецыялістаў у галіне краязнаўства, але і музейнай справы [4, арк. 290].

Нягледзячы на тое, што рэзалюцыя наркома асветы БССР А. В. Баліцкага была станоўчая, але яна была рэалізавана ў некалькі іншым фармаце.

Як ужо адзначалася, з мэтай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне краязнаўства ў 1927/28 навучальным годзе ў БДУ былі арганізаваны краязнаўчыя курсы. Слухачамі гэтых курсаў былі аматары-краязнаўцы, якія, акрамя ўсебаковага вывучэння сваёй мясцовасці, павінны былі арганізоўваць краязнаўчыя музеі. Курс «Музеязнаўства і музеябудаўніцтва» чытаў тагачасны дырэктар БДМ і знакаміты беларускі навуковец В. Ю. Ластоўскі [1, с. 85]. На жаль, канспект лекцый В. Ю. Ластоўскага пакуль не выяўлены. Прымаючы пад увагу артыкул навукоўца, можна меркаваць, што В. Ю. Ластоўскі распавядаў пра гісторыю музейнай справы ў краіне, выказваў свае думкі наконт сённяшняга і будучага стану музейнай справы, прынцыпам арганізацыі і дзейнасці музеяў.

Такім чынам, выпускнікі названых курсаў атрымлівалі пэўныя веды ў галіне музеязнаўства. Гэтыя курсы можна назваць першым вопытам падрыхтоўкі музейных кадраў. Аднак, нягледзячы на значную патрэбу ў музеязнаўчых і краязнаўчых ведах увогуле, курсы праіснавалі вельмі непрацяглы перыяд.

Да азначанай праблемы зноў звярнуліся ў пачатку 1930-х гг. На Усебеларускай нарадзе музейных супрацоўнікаў у 1932 г. сектару кадраў было даручана ў 1932 г. правесці перападрыхтоўку 25–30 музейных работнікаў праз сістэму курсаў. Было вырашана пры Магілёўскім палітасветным тэхнікуме адкрыць музейнае аддзяленне для падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў з сярэднеспецыяльнай адукацыяй. Планавалася адкрыць і завочную форму навучання ў той жа ўстанове па той жа спецыяльнасці [5, с. 85]. Пастанова ЦК КП(б)Б патрабавала арганізаваць музейную спецыялізацыю ў БДУ і ВПШ [2, с. 143]. Аднак сістэма падрыхтоўкі музейных кадраў у даваенны перыяд у нашай краіне так і не была створана.

Больш грунтоўна ў Беларусі да падрыхтоўкі музейных спецыялістаў (музеёлагаў, арганізатараў музейнай справы) прыступілі ў пачатку 1990-х гг. У 1992 г. на гістарычным факультэце БДУ было адкрыта аддзяленне музеязнаўства і архівазнаўства. Тады ж, у 1992 г., была створана кафедра крыніцазнаўства і музеялогіі. На спецыяльнасць «музеязнаўства і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ахова помнікаў гісторыі і культуры» студэнтаў пачалі набіраць толькі з 1994 г. Праграма, паводле якой ішло навучанне, будавалася на тых жа прынцыпах, што і ў Расійскім дзяржаўным гуманітарным універсітэце. На першых двух курсах студэнты атрымлівалі грунтоўныя веды па агульнагістарычных, культурна-гістарычных і мастацтвазнаўчых дысцыплінах, а пачынаючы з трэцяга курса, – паглыбленую спецыялізацыю па асноўных напрамках работы сучасных музеяў. Студэнты праходзілі некалькі вучэбна-вытворчых практык – археалагічную, азнаямляльную музейную, экскурсійную і фондавую. Па заканчэнні студэнты першых выпускаў атрымалі спецыяльнасць «музеёлаг, арганізатар музейнай справы». У канцы 1990-х гг., пасля ўвядзення ў праграму курсаў педагагічнага цыкла, дадалася яшчэ адна – «выкладчык гісторыі», а праз пэўны час і такія спецыялізацыі, як «менеджар па турызме» і «мастацтвазнавец». 30 чэрвеня 2001 г. кафедра крыніцазнаўства і музеялогіі была рэарганізавана. Замест яе падрыхтоўка музейных спецыялістаў была пераведзена на новастворную кафедру этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў. Гэтая кафедра забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» па кірунках «культурная спадчына і турызм», «музеялогія і мастацтвазнаўства», «гісторыя і музеялогія».

У 1993 г. на факультэце мастацтваў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (ЕГУ) была створана кафедра музеязнаўства і культурнага турызму. Яна рыхтавала спецыялістаў па музейнай справе і ахове помнікаў гісторыі і культуры са спецыялізацыяй «культурная спадчына і міжнародны турызм» і забяспечвала кваліфікацыю: мастацтвазнавец, менеджар па турызме. Пасля 2004 г. універсітэт перамешчаны ў Літву.

З 1994 г. спецыялістаў у сферы музейнай справы і аховы помнікаў пачалі рыхтаваць на факультэце культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ў Беларускім універсітэце культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). Тады ж была створана кафедра этнаграфіі і музеязнаўства, якая на працягу апошніх 15 гадоў неаднаразова мяняла сваю назву. Праз некалькі гадоў падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці «музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры» пераведзена на факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. За час існавання спецыяльнасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў змянілася некалькі вучэбных планаў. Сёння кафедра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыі Беларусі і музеязнаўства забяспечвае падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і напрамках спецыяльнасці «музеязнаўства» і «культурная спадчына і турызм» з прысваеннем кваліфікацыі адпаведна «музеязнавец» і «менеджар па культурнай спадчыне і турызме».

У 1999 г. на кафедры гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава (ВДУ) пачалі рыхтаваць спецыялістаў у галіне музейнай справы, аховы помнікаў гісторыі і культуры і турызму. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю «мастацтвазнавец, менеджар па турызме». Першы выпуск спецыялістаў адбыўся ў 2004 г.

У 2010 г. падрыхтоўку спецыялістаў у галіне музейнай справы па напрамку «гісторыя і музеялогія» з прысваеннем кваліфікацыі «гісторык-музеёлаг, выкладчык» распачалі пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны.

Для перападрыхтоўкі музейных практыкаў, якія не маюць прафесійнай музейнай адукацыі, у 1993 г. на базе Беларускага інстытута праблем культуры (БелІПК) была створана двухгадовая Школа музеялогіі.

Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што ў Беларусі на сёння назапашаны значны вопыт падрыхтоўкі музейных спецыялістаў. У 1920-я гг. заснавальнікі беларускай навукі і адукацыі, выдатныя дзеячы беларускай культуры У. І. Пічэта, В. Ю. Ластоўскі і іншыя ўсведамлялі неабходнасць і запатрабаванасць прафесійных музейных супрацоўнікаў. Яны, супрацоўнікі Інбелкульта і БДУ, заклалі падмурак музейнай адукацыі ў Беларусі. Ганаровы пачатак у гэтай справе належыць старэйшай ВНУ у Беларусі – Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту.

Па шэрагу прычын сацыяльна-палітычнага характару традыцыя прафесійнай падрыхтоўкі музейшчыкаў у сістэме ВНУ на доўгія гады была перарвана. З канца 1920-х гг. фактычна па пачатак 1990-х гг. у музеі прыходзілі працаваць асобы з агульнагуманітарнай адукацыяй: гісторыкі, філолагі, педагогі. Гэта садзейнічала развіццю профільных музейных дысцыплін, але не спрыяла фарміраванню ўласна музейнай навукі.

У пэўным сэнсе спрыяльнымі фактарамі для развіцця музея як сацыяльнага інстытута наогул і музейнай адукацыі ў прыватнасці з’явіліся падзеі 1990-х гг. У гэты час у розных ВНУ Беларусі адкрываюцца музейныя спецыяльнасці. Можна сцвярджаць, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблема атрымання спецыялізаванай музейнай адукацыі ў нашай краіне вырашана. На чарзе яе якаснае ўдасканаленне: мадэрнізацыя навучання, карэкціроўка вучэбных праграм у адпаведнасці з практыкай музейнай дзейнасці і ўлік сусветнага музейнага вопыту.


1. *Аніхоўскі, А.* Праца Таварыства краязнаўства пры Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце ў 1927-28 / А. Аніхоўскі, В. Невядомскі // Наш край. – 1928. – № 6-7. – С. 79–86.

2. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2002. – 176 с.

3. *Нацыянальны* архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 249. – Воп. 2. – Спр. 162. – Арк. 27.

4. *Нацыянальны* архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 1927. – Арк. 290.

5. *Пастанова* №58 Калегіі Народнага камісарыята асветы БССР ад 11 красавіка 1932 г. «Аб выніках Усебеларускай нарады музейных работнікаў» // Савецкая краіна. – 1932. – № 4. – С. 84–85.

6. *Первая* всебелорусская конференция архивных работников, 12–15 мая 1924 г.: документы и материалы / сост. М. Ф. Шумейко. – Минск: БелНИИДАД, 1999. – 148 с.

7. *Фролов, А. И.* Музееведческое образование / А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. – М.: Прогресс: РИПОЛ классик, 2001. – Т. 1. – С. 289–290.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ